НУ


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 14 чэрвеня 2001 года, чацвер, № 11 (1840)


**АКТУАЛЬНА**

## БУДЗЕ ПРЫНЯТЫ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

19 чэрвеня ў актавай зале навучальнага корпуса Белдзяржуніверсітэта па вул. К. Маркса, 31 у 15 гадзін адбудзецца канферэнцыя па заключэнні калектыўнага дагавора паміж адміністрацыяй і прафкамам БДУ на 2001-2003 гады. Напярэдадні канферэнцыі прафсаюзнай арганізацыяй БДУ была праведзена вялікая праца па абмеркаванні праекта калектыўнага дагавора, які друкаваўся ў нашай газеце. На мерапрыемстве будзе прысутнічаць кіраўніцтва універсітэта, а таксама дэлегаты ад усіх структурных падраздзяленняў, якія прыйдуць туды са сваімі прапановамі і заўвагамі.

*Вольга АНІНА*

**ФОТАПОЗІРК**



*Студэнтка 4-га курса групы хіміі цвёрдага цела хімічнага факультэта БДУ Лідзія Бабіцкая на занятках у лабараторыі*

*Фота IREX/PROMEDIA*

**КОНКУРСЫ**

## АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС НА САІСКАННЕ ПРЭМІЙ ІМЯ У.І. ПІЧЭТЫ І ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ, ПРЫМЕРКАВАНЫ ДА 80-ГОДДЗЯ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

Прэмія імя У.І. Пічэты прысуджаецца ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, прэмія імя А.Н. Сеўчанкі — у галіне прыродазнаўчых навук навукоўцам Беларускага дзяржаўнага універсітэта за выдатныя дасягненні, якія ўключаюць:

навуковыя працы па перспектыўных накірунках, якія ўносяць значны ўклад у развіццё адпаведнай галіны навукі і тэхнікі;

стварэнне новай тэхнікі, тэхналогіі і матэрыялаў;

работы, накіраваныя на зберажэнне рэсурсаў і энергіі, абарону навакольнага асяроддзя і вырашэнне іншых важных для рэспублікі задач;

распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;

стварэнне падручнікаў, навучальных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Паводле палажэння, зацверджанага загадам рэктара № 97-ОД ад 15.05.2001, **камісія па прысуджэнні прэміі імя А.Н. Сеўчанкі** складаецца з прэзідыума (старшыня доктар хімічных навук С.К. Рахманаў) і чатырох камітэтаў:

1. Фізіка (старшыня доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар А.А. Мінько), тэл. 277-50-34;
2. Матэматыка (старшыня член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар В.І. Карзюк), тэл. 226-58-80;
3. Хімія (старшыня доктар хімічных навук А.А. Івашкевіч), тэл. 226-51-41;
4. Біялогія і геаграфія (старшыня член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук А.П. Астапеня), тэл. 277-59-36, 277-55-35.

**Камісія па прысуджэнні прэміі імя У.І. Пічэты** складаецца з прэзідыума (старшыня доктар хімічных навук С.К. Рахманаў) і трох камітэтаў:

1. Філалогія і журналістыка (старшыня доктар філалагічных навук, прафесар А.І. Яновіч), тэл. 222-34-21;
2. Гісторыя, філасофія, эканоміка (старшыня доктар філасофскіх навук, прафесар А.І. Зелянкоў), тэл. 227-60-25;
3. Правазнаўства і міжнародныя адносіны (старшыня доктар юрыдычных навук, прафесар А.В. Дулаў), тэл. 222-83-42.

*Электронную версію палажэння можна атрымаць на e-mail. Для гэтага неабходна папярэдне ператэлефанаваць па тэл. 209-54-27 у галоўнае ўпраўленне навукі БДУ (вул. Бабруйская, 9, пакой 418, А.Г. Захараў) і пакінуць адрас электроннай пошты.*

**БІРЖА ПРАЦЫ**

# *Летні семестр*

Куды падацца летам? Дзе адпачыць? Дзе падпрацаваць? Гэтыя пытанні наноў паўстаюць кожнае лета перад студэнтамі.

Маладзёжныя арганізацыі нашага універсітэта — Студэнцкі саюз і БПСМ — арганізуюць летні працоўны семестр 2001 года па самых розных накірунках.

Перш за ўсё трэба назваць будаўнічыя студэнцкія атрады, якія будуць працаваць у Мінску з 1 ліпеня. Абяцаны заробак выглядае досыць прывабна (ад 100 000 рублёў), але набіраць у гэтыя атрады будуць толькі хлопцаў: праца на будоўлі вымагае цяжкіх фізічных высілкаў. З 1 ліпеня пачнуць працу амаль 100 першых прэтэндэнтаў, але вольныя месцы яшчэ ёсць. Жадаючыя папрацаваць на мінскіх будоўлях могуць звяртацца ў пакой 205 галоўнага корпуса універсітэта (тэл. 209-52-61).

Другім накірункам летняй працы, арганізаванай маладзёжнымі структурамі БДУ, будуць педагагічныя атрады. Іх месца працы — дзіцячыя аздараўленчыя лагеры ў Мінскай вобласці. Там чакаюць важатых, памочнікаў выхавацеляў і тэхнічны персанал. Тыя, хто выбера гэты від працы на летні сезон, будуць забяспечаныя пражываннем і харчаваннем.

Самай прывабнай выглядае трэцяя прапанова — пасёлак Штармавой у Сакскім раёне (Крым), які знаходзіцца ў 18 км ад Еўпаторыі. Студэнты, якія паедуць туды, будуць пражываць на базе адпачынку Сімферопальскага машынабудаўнічага завода на беразе мора ў летніх доміках. У жніўні будуць арганізаваныя два заезды (па два тыдні кожны) па 40 чалавек. На вялікі жаль, набор жадаючых адпачыць у Крыме скончаны. А тыя, каму пашчасціла патрапіць у невялікі лік, змогуць паехаць і проста адпачыць, і папрацаваць на добраўпарадкаванні базы.

*Вольга СКАРБІШ*

**З НАГОДЫ**

# *Адпачынак. Які ён сёлета?*

Як паведамілі карэспандэнту газеты "Беларускі універсітэт" у прафсаюзным камітэце супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта, 4 чэрвеня адбыўся першы заезд у дзіцячыя аздараўленчыя лагеры "Горизонт" і "Волна". 82 дзіцяці супрацоўнікаў нашага універсітэта адпачываюць там у першую летнюю змену. І гэта нягледзячы на тое, што дзіцячыя пуцёўкі сёлета аказаліся даволі дарагімі (па 210 тысяч), і універсітэт быў вымушаны аплочваць 115 тысяч за кожную. Дзякуючы дапамозе рэктарата і прафкама супрацоўнікаў БДУ стаў магчымым не толькі гэты заезд, але і другі, і трэці, якія яшчэ наперадзе.

Як заўсёды, не будуць летам абдзеленымі ўвагай і дарослыя. Прафкам супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта прапануе ім адпачыць у ліпені-жніўні па дванаццаць дзён у санаторыі-прафілакторыі Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, а ў жніўні — па дванаццаць і чатырнаццаць дзён на Валожынскай вучэбнай базе геаграфічнага факультэта.

Акрамя гэтага, кожны, хто мае патрэбу ў лячэнні, можа падаць заяву ў прафкам і атрымаць пуцёўку ў санаторый.

*Вольга АНІНА*

**ІНІЦЫЯТЫВА**

# *Свята ў Станькаве*

Байкеры! Са скавытаннем матораў і грукатам музыкі ўварваліся яны на стадыён Станькаўскай школы-інтэрната, змусіўшы натоўп сціснуцца — аж заняло дых. Разбойны напад? Не, сумесная дабрачынная акцыя мотаклуба "Жалезныя браты", Саюза жанчын Белдзяржуніверсітэта, Міжнароднага фонду клопату пра дзяцей і нямецкай арганізацыі "Рука дапамогі", якая адбылася на пачатку чэрвеня. Апрача таго, у акцыі прынялі ўдзел студэнты-валанцёры з педагагічнага каледжа і медыцынскага вучылішча № 2, арганізатары-зацейнікі і ды-джэй Саша Снегіна.

Вядома ж, паглядзець на гэты "цуд", нібыта ў заапарк (даруйце за параўнанне!), сабраўся ўвесь гарадок. І, канечне, адарваць дзяцей ад сапраўды прыгожых матацыклаў, сабраць іх у кола і заняць гульнямі было вельмі складана. Таму намаганні валанцёраў можна назваць проста гераічнымі: ім удалося не толькі сабраць дзяцей вакол сябе, але і сапраўды зацікавіць гульнямі. Таварыскі футбольны матч (байкеры супраць школьнай зборнай) скончыўся перамогай дзяцей. А напрыканцы сустрэчы сем лепшых вучняў школы змаглі пракаціцца на матацыклах. Бачылі б вы шчасце на іх тварах!

Па словах дырэктара школы-інтэрната, справы ва ўстанове ідуць не дужа добра (і ў гэтым лёгка было пераканацца нават падчас павярхоўнага агляду будынка і наваколля). Але нават тое нямногае, што было зроблена ў гэты дзень, мае вельмі вялікае значэнне. Дзеці атрымалі яшчэ адно пацвярджэнне, што яны не зусім адзінокія ў гэтым свеце.

*Любоў БАРТУЛЁВА,*
*студэнтка факультэта журналістыкі*

**АСОБЫ**

# БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

Саюз жанчын БДУ сярод іншых накірункаў сваёй дзейнасці імкнецца выяўляць таленавітых студэнтаў універсітэта і спрабуе знаходзіць сродкі, каб можна было дапамагчы ім. Зусім нядаўна арганізацыя звярнула сваю ўвагу на незвычайнага студэнта — трэцякурсніка геаграфічнага факультэта БДУ Андрэя Нікалаева. Яму 26 год, і апошнія 6 гадоў ён не можа хадзіць з-за цяжкой траўмы. Гэты ўдар лёсу не зламіў яго: хлопец робіць усё магчымае для сваёй фізічнай і маральнай рэабілітацыі.

Андрэй Нікалаеў — паэт. Летась выйшла яго першая кніга вершаў "Будзеш жыць, браток!" Яна невялікая па памеры, і большасць вершаў у ёй — на ваенна-патрыятычную тэматыку. Пасля яе выхаду да Андрэя пачалі прыходзіць шматлікія лісты ад чытачоў — пераважна ад вайскоўцаў. Літаральна днямі выйдзе ў свет другая кніга Андрэя Нікалаева — "Дар шамана". Выпускае яе, як і першую, на свае сродкі выдавецтва "Тэхнапраект". Акрамя вершаў, у кніжцы будуць апублікаваныя пэўныя біяграфічныя звесткі пра аўтара.

У сваіх творчых пошуках Андрэй Нікалаеў не спыняецца ні на хвіліну. Зараз ён разам з Валерыем Івановым працуе над выпускам магнітаальбома. Плануецца, што называцца ён стане "Будзем жыць!" Пра час яго выхаду гаварыць пакуль што рана — наперадзе шмат працы. Вершы ў магнітаальбоме будуць Андрэя Нікалаева, музыка — Валерыя Іванова. Такі від працы — новы для паэта, але хлопец з энтузіязмам узяўся за яго.

Па натуры Андрэй Нікалаеў — невыпраўны аптыміст: ён верыць і ўвасабляе свае мары ў жыццё. Нядаўна ён зрабіў тое, пра што думаў даўно: скачок з парашутам (разам з інструктарам). У Расіі такія скачкі сярод інвалідаў-калясачнікаў практыкуюцца з 1996 года, а ў Беларусі гэта пакуль толькі пачатак. Гэты скачок вельмі ўразіў Андрэя, і ён не збіраецца спыняцца на дасягнутым. Цяпер у яго з'явілася новая мара — дапамагчы іншым інвалідам-калясачнікам перажыць адчуванне свабоднага палёту. Ён ніколькі не сумняецца, што ў хуткім часе паўторыць скачок, але на гэты раз ужо сам будзе кіраваць сваім палётам. Скокнуць з парашутам ён марыў з 1988 года — да траўмы, аднак зрабіць гэта здолеў толькі тады, калі гэта здавалася амаль немагчымым.

Планы і мары перапаўняюць Андрэя Нікалаева — трэба зрабіць так шмат! Ён, чалавек, якому самому вельмі патрэбная дапамога, нясе святло сваіх вершаў іншым. Можа, у гэтым і ёсць сакрэт ягонага аптымізму і веры ў лепшае?..

А Саюз жанчын Белдзяржуніверсітэта і надалей будзе аказваць Андрэю дапамогу. Паэт ужо атрымаў ад арганізацыі інвалідную каляску, а ў хуткім часе Саюз жанчын плануе падарыць яму камп'ютэр, каб спрасціць хлопцу працу над вершамі.

*Ала БАГДАНАВА*

# АПТЭКА Ў БДУ

У рамках праграмы "Экалогія чалавека" Саюз жанчын нашага універсітэта разам з фірмай "Інтэрафіцына+" адкрыў аптэчны кіёск. Гэтым адкрыццём была вырашаная адна з актуальных сацыяльных задачаў універсітэта: забеспячэнне медыкаментамі і спадарожнымі таварамі студэнтаў і супрацоўнікаў трох факультэтаў – радыёфізікі і электронікі, біялагічнага, фундаментальнай і нетрадыцыйнай медыцыны. Усе гэтыя факультэты сабраныя разам на тэрыторыі філіяла БДУ. Аптэчны кіёск знаходзіцца ў інтэрнаце № 3 (вул. Курчатава, 6).

На базе аптэчнага кіёска Саюз жанчын мяркуе атрымліваць і размяркоўваць гуманітарную дапамогу ў выглядзе медыкаментаў і вітамінаў для ўсіх супрацоўнікаў Белдзяржуніверсітэта.

У аптэцы прадстаўлены шырокі асартымент фармакалагічных сродкаў, траваў, прадметаў гігіены. Кошты тут на 20-25 % ніжэй, чым у аналагічных установах горада. Працуе аптэка штодзённа з 13 да 20 гадзінаў, акрамя суботы і нядзелі. Праезд аўтобусам № 47 "пл. Незалежнасці – філіял БДУ".

*А.В. СІДАРЭНКА,*
*дацэнт кафедры фізікі,*
*кандыдат тэхнічных навук,*
*куратар праграмы*



## УСТАНОВА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў;

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак.

Тэрмін падачы дакументаў – 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

*Дакументы прымаюцца па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*



# СТУДЭНЦКАЯ СЛУЖБА БЯСПЕКІ

*Мабыць, няма такога студэнта, які б не чуў пра Студэнцкую службу бяспекі. Пагатоў, што складаецца яна з саміх студэнтаў. Можна прыгадаць святы і вечары, якія праходзяць ва універсітэце, хлопцаў "пры парадзе", якія сустракаюць вас у дзвярах, цікавяцца наяўнасцю квітка і не зводзяць з вас вачэй на працягу ўсяго вечара. Дзеля вашай жа бяспекі.*

*Гэта і ёсць яна – Студэнцкая служба бяспекі.*

**Камандзір Уладзімір Ляхавец (факультэт радыёфізікі і электронікі, V курс):**

*– Чаму ўзнікла неабходнасць стварэння ССБ? Чыя гэта была ідэя?*

– Ініцыятыву праявіла Служба аховы і бяспекі БДУ: яна падала заяўку ва ўпраўленне па выхаваўчай рабоце БДУ. А ўжо ўпраўленне адбірала людзей з оператрадаў інтэрнатаў, якія дапамагалі падтрымліваць парадак на агульнауніверсітэцкіх мерапрыемствах. Недзе ў сакавіку 1999 года ўзнікла ідэя стварыць адзін агульны атрад.

*– Што гэта за структура – Студэнцкая служба бяспекі?*

– ССБ з'явілася на свет у маі 1999 года. Спярша гэта быў невялікі атрад з 15 чалавек, прызначаны для дапамогі супрацоўнікам Службы аховы і бяспекі Белдзяржуніверсітэта ў падтрыманні правапарадку на агульнауніверсітэцкіх мерапрыемствах. Потым служба бяспекі развівалася вельмі імкліва. Увесну 2000 года ССБ была рэарганізаваная пры дапамозе студгарадка БДУ. Сёння гэта ўжо грамадская студэнцкая арганізацыя з 32 чалавек. У кожным інтэрнаце ёсць невялікія мабільныя групы з 3-6 чалавек на чале з камандзірам (ён жа адначасова і камандзір оператрада). Апрача таго, гэта атрад, які працуе на ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Белдзяржуніверсітэце і студгарадку БДУ. Дзеля ўмацавання юрыдычных правоў супрацоўнікаў ССБ было наладжана супрацоўніцтва з адміністрацыяй Маскоўскага раёна, і ўсе супрацоўнікі атрымалі пасведчанні дружыннікаў. Гэта азначае, што супрацоўнік нашай службы бяспекі мае правы паставога міліцыянера.

*– Ці аплочваецца гэтая праца?*

– Аплочваецца праз агульнауніверсітэцкі фонд, але аплата дыферэнцыраваная. Заробак супрацоўніка ССБ залежыць ад таго, наколькі актыўна ён працаваў, на якіх мерапрыемствах падтрымліваў парадак, наколькі ўдалымі былі гэтыя мерапрыемствы, як часта ён удзельнічае ў такіх мерапрыемствах. Гэтыя пытанні разглядаюцца Саветам па прэміраванні і агульным сходам службы бяспекі.

*– А як можна суцішыць буйнага студэнта? Якія паўнамоцтвы ў вашай службы?*

– Калі гэта студэнт БДУ, то можна прымяніць санкцыі праз універсітэт, факультэт, студгарадок (калі ён жыве ў інтэрнаце). Санкцыі гэтыя вядомыя – у першую чаргу, вымова. Мы складаем акт, які разглядаецца студсаветам інтэрната (для тых, хто жыве ў інтэрнаце) ці Службай аховы і бяспекі БДУ. Там прымаецца рашэнне, якое потым ідзе ў дэканат. Калі чалавек не навучаецца ў БДУ, тады мы перадаем акты ў УУС Маскоўскага раёна, з якім у нас ёсць дамоўленасць. Там акты разглядаюцца ўжо на агульнагарадскім узроўні.

*– Ці могуць у Студэнцкай службе бяспекі працаваць і дзяўчаты?*

– Я ў свой час быў камандзірам оператрада, у якім была і дзяўчына. Па сваім досведзе скажу, што гэта не самы лепшы выбар. Да дзяўчат ставяцца інакш: дзяўчаты не могуць, як хлопцы, на дыскатэцы ці на іншым мерапрыемстве паставіць сябе і паказаць сваё "я".

*– Ну, гэта як сказаць...*

– Я хачу дадаць, што дзяўчаты не могуць уваходзіць у мабільную групу, якая падтрымлівае парадак на дыскатэках.

*– Зразумела, зноў дыскрымінацыя.*

– Зусім не. У нас працуе дзяўчына-дыспетчар. Сёння ў нашай службы ёсць свой офіс, тэлефон 278-13-27. Там з 19 гадзінаў у будзённыя дні дзяжураць дыспетчары. Туды можна затэлефанаваць, задаць пытанні дыспетчару, прызначыць сустрэчу. У дыспетчараў ёсць уся інфармацыя па студгарадку. Кожны студэнт, кожны жыхар інтэрнатаў БДУ ці супрацоўнік оператрада можа выказаць свае прэтэнзіі дыспетчару па тэлефоне (напрыклад, паскардзіцца на камандзіра оператрада, калі ён перавышае свае паўнамоцтвы ці паводзіць сябе не зусім карэктна). Ці, наадварот, можна падзякаваць.

**Хлопцы з ССБ:**

*– Дзеля чаго вы ідзяце ў службу бяспекі – дзеля выгоды ці па асабістай ініцыятыве?*

– Калі я пажыў у інтэрнаце і папрацаваў у оператрадзе, адчуў сябе па-новаму. У інтэрнаце я ўжо не шараговы жыхар, а на парадак вышэй: на мне ляжыць адказнасць. Я не магу дазволіць сабе таго, што могуць іншыя (напрыклад, пашумець пасля 23 гадзінаў), я ўжо абавязаны быць узорам.

*– І атрымліваецца?*

– Так, гэта не асабліва цяжка.

*– У сэнсе, лепей хадзіць па пакоях, кантраляваць кагосьці...*

– Гледзячы як хадзіць... Можна патрапіць да прыемных дзяўчат на гарбату.

*– Дык гэта спосаб знаёміцца з дзяўчатамі?*

– Дарэчы, так яно і ёсць: некаторыя выбіраюць менавіта такі спосаб знаёмства.

*Вось такія яны, супрацоўнікі Студэнцкай службы бяспекі, – вясёлыя, таварыскія. Дарэчы, у той час, як матэрыял быў ужо падрыхтаваны да друку, стала вядома, што ў ССБ змяніўся камандзір: цяпер гэтую пасаду займае Аляксандр Малевіч (факультэт радыёфізікі і электронікі, II курс).*

*Крысціна СТАНКЕВІЧ,*
*кіраўнік*
*інфармацыйнай службы*
*студгарадка БДУ*

# НА ПЕРАЛОМЕ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ ГІСТОРЫІ

## Рэктар БДУ Іван Фядотавіч Ермакоў



30-я гады распачыналіся для БДУ як час вялікіх зменаў. Мянялася не толькі структура універсітэта, мянялася ўсё універсітэцкае жыццё. Адыходзілі ў нябыт традыцыі 20-х гадоў з іх пасяджэннямі студэнтаў і прафесараў на агульных сходах, выбарнасцю рэктараў, удзелам студэнцкіх арганізацый у кіраванні універсітэтам. У кіраўніцтва універсітэта прыходзілі новыя людзі. Часцяком яны не зусім адпавядалі гэтаму высокаму ўзроўню і самі разумелі гэта, але такім быў загад вышэйшага партыйнага кіраўніцтва, не падначальвацца якому было небяспечна. Вось у такіх варунках пачаў сваю працу новы рэктар БДУ Іван Фядотавіч Ермакоў.

Нарадзіўся Іван Фядотавіч 24 лютага 1892 года ў вёсцы Пруднікава Гарадоцкага павета Віцебскай губерні ў сям'і селяніна-серадняка. Ён меў сярэднюю педагагічную адукацыю, да 1917 года настаўнічаў. Верагодна, Іван Фядотавіч скончыў настаўніцкую семінарыю. Вучыўся ён, мабыць, у Полацкай настаўніцкай семінарыі ў 1908-1912 гадах, а пасля — настаўнічаў. Вядома, што ў 1918 годзе ён уступіў у шэрагі РКП(б), а ў час грамадзянскай вайны па першай партыйнай мабілізацыі быў пасланы на Усходні фронт, пасля ўдзельнічаў у баях і на Паўднёвым фронце. Але падрабязнасці гэтых яго біяграфічных старонак нам пакуль невядомыя.

У Беларусь ён вяртаецца ў 1925 годзе. У 1926 годзе І.Ф. Ермакова накіравалі ў Мазыр загадчыкам акруговага аддзела народнай асветы. Вялікую дапамогу ў гэтай працы яму аказаў інспектар школ Народнага камітэта асветы Беларусі А. Аніхоўскі (дарэчы, выпускнік БДУ). І.Ф. Ермакоў актыўна ўключыўся ў працу па беларусізацыі школаў і іншых установаў. Як пісаў ён сам, у той час усё было насычанае любоўю да ўсяго беларускага. Па яго запрашэнні Мазыр наведаў Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам знакамітага У.І. Галубка.

У 1928 годзе па прапанове тагачаснага наркама асветы БССР А.В. Баліцкага яго прызначылі загадчыкам Менскага акруговага аддзела народнай асветы. На гэтай пасадзе І.Ф. Ермакоў дбаў пра адкрыццё новых школ, хатаў-чытальняў. На нарадах ён адзначаў неабходнасць таго, каб беларускія дзеці навучаліся ў беларускіх школах, яўрэйскія — у яўрэйскіх, польскія — у польскіх, рускія — у рускіх. Клапаціўся І.Ф. Ермакоў і пра адпаведныя настаўніцкія кадры, зважаючы на іх прафесійныя якасці, а не на сацыяльнае паходжанне. Тады гэта было нармальна, пазней — было адпаведна вытлумачана органамі НКУС.

У ліпені 1930 года Менская акруга была ліквідавана, і скасавана пасада І.Ф. Ермакова. Новы наркам асветы Беларусі А.М. Платун прапанаваў СНК БССР прызначыць І.Ф. Ермакова дырэктарам новага аграпедагагічнага інстытута (сёння — Гомельскі універсітэт імя Ф. Скарыны). На новага дырэктара лёг увесь цяжар арганізацыйнай працы: падбор адпаведных памяшканняў, штату выкладчыкаў, набор студэнтаў і г.д.

Наркам асветы двойчы наведваў аграпедагагічны інстытут. У лістападзе 1931 года ён прапанаваў І.Ф. Ермакову пераехаць у Менск на пасаду рэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Іван Фядотавіч адмаўляўся: маўляў, ён па адукацыі сельскі настаўнік, у ВНУ сам не выкладаў, займаўся адміністрацыйнай справай, а таму ні ў адукацыйных праграмах, ні ў ацэнцы падручнікаў правільна не разбярэцца. Аднак на падобныя пярэчанні тады не звярталі ўвагі: па ўсім СССР адчыняліся сотні новых інстытутаў, а шмат хто з высокакваліфікаваных навукоўцаў паехаў (вядома, не па сваім жаданні) будаваць Беламорканал ці сячы лес. І зусім не дзіўна, што ўчорашніх студэнтаў прызначалі дырэктарамі тэхнікумаў, інстытутаў, намеснікамі дырэктароў НДІ, цесляра — дырэктарам вучылішча, настаўніка — загадчыкам кафедры біяфізікі.

Паводле пастановы калегіі Наркамата асветы БССР, І.Ф. Ермакоў з 1 снежня 1931 года быў прызначаны рэктарам БДУ. Універсітэт у гэты час перажываў наступствы рэарганізацыі. З 1 жніўня 1931 года ў адпаведнасці з пастановай СНК БССР канчаткова самастойнымі сталі інстытуты, створаныя на базе факультэтаў БДУ: вышэйшы педінстытут — з двух аддзяленняў педфака, Інстытут савецкага будаўніцтва і права — з факультэта савецкага будаўніцтва і права, планава-эканамічны, фінансавы, кааператыўны інстытуты — з факультэта народнай гаспадаркі. Яшчэ раней самастойнымі інстытутамі сталі медыцынскі і хіміка-тэхналагічны факультэты. Скарацілася і колькасць студэнтаў ва універсітэце. Калі ў кастрычніку 1930 года ў БДУ навучаліся 1525 студэнтаў (без уліку рабфаку), то ўлетку 1931 года — 341. У восеньскі набор было прынята 94 чалавекі.

Згодна з той жа пастановай СНК, у БДУ планавалася стварыць на базе фізіка-тэхнічнага і прыродазнаўчага аддзяленняў педфака новыя факультэты: фізіка-матэматычны, біялагічны, хімічны і геаграфічны. Аднак да пачатку восеньскага набору ўдалося стварыць толькі фізіка-матэматычны і хімічны факультэты з беларускімі і яўрэйскімі секцыямі. Крыху пазней пачаўся набор на біялагічны факультэт.

У гэты час БДУ працаваў у рэжыме бесперапыннага навучальнага года. Прыём студэнтаў адбываўся двойчы на год — увосень і ўзімку. Па агульнасаюзных пастановах экзамены былі адмененыя: распяховасць студэнтаў вызначалася "на аснове сістэматычнага і працяглага назірання за студэнтамі з боку кіраўніка заняткаў". У навучальнай рабоце панаваў "брыгадна-лабараторны" метад, мэта якога — падрыхтоўка "не спецыяліста-энцыклапедыста, а пралетарскіх спецыялістаў, добра ўзброеных тэорыяй рэвалюцыйнага бальшавізму". Пры прыёме студэнтаў панаваў "класавы падыход".

Першымі загадамі новы рэктар імкнуўся нармалізаваць становішча з аўдыторыямі і інтэрнатамі. Пасля рэарганізацыі матэрыяльная база БДУ знаходзілася ў хаатычным стане: на тэрыторыі універсітэцкага гарадка размяшчаліся навастворанargыя інстытуты, частка інтэрнатаў БДУ была забрана. Новапабудаваныя інтэрнаты былі без электрычнасці і вадаправода. Справа спрашчалася толькі адносна невялікай колькасцю студэнтаў у БДУ.

Горш было з побытавым становішчам у інтэрнатах. Студэнты, якія прыходзілі ва універсітэт, былі рознымі, мелі своеасаблівыя ўяўленні пра культуру паводзінаў. У інтэрнатах так павялічыліся крадзяжы маёмасці студэнтаў, што кіраўніцтва БДУ вымушана было звярнуцца ў крымінальны вышук. Неахайнымі былі паводзіны студэнтаў і ў карпусах універсітэта. Таму ў маі 1932 года былі створаны "Правілы ўнутранага распарадку і нагрузкі студэнтаў". Яны рэгулявалі колькасць гадзінаў на заняткі, самастойную і грамадскую работу ўдзень, працягласць акадэмічнай гадзіны (50 хвілінаў), перапынкаў і г.д. Забаранялася праводзіць сходы і грамадскія працы ў навучальны час, наведваць аўдыторыі ў верхняй вопратцы і калёшах, курыць у памяшканнях і г.д.

Галоўную ўвагу І.Ф. Ермакоў надаваў навучанню студэнтаў. Ён мог абапірацца на моцны педагагічны калектыў, які захаваўся ў БДУ: тут працавалі прафесары Ц.Л. Бурстын, Я.К. Успенскі, М.Ф. Бліядуха, А.У. Фядзюшын, М.Ф. Ярмоленка, Я.П. Громэр, М.А. Прыляжаеў, І.С. Пятосін, Я.У. Рол і іншыя. Усяго педагагічны персанал БДУ складаў тады 132 чалавекі (значная частка працавала па сумяшчальніцтве): з іх 13 прафесараў, 24 дацэнты, 23 асістэнты.

Да вясны 1932 года сталі больш выразна выяўляцца хібы ў навучальным працэсе. У загадзе рэктара адзначаліся такія недахопы лабараторна-брыгаднага метаду, як неаднароднасць брыгад, зніжэнне ролі выкладчыка, адсутнасць самастойнай працы студэнтаў. Дэканы факультэтаў паведамлялі пра перагружанасць

студэнтаў матэрыялам, пра адсутнасць дыферэнцыраванага падыходу да кожнай дысцыпліны, пра тое, што роля выкладчыка зведзена да рэпетытарства, а студэнты проста завучваюць параграфы.

У канцы чэрвеня 1932 года адбыўся ці не самы малы выпуск студэнтаў БДУ — 82 спецыялісты. 16 ліпеня Наркамат асветы прыняў пастанову, якая павышала статус БДУ. Ва універсітэце ўсталяваўся 4-гадовы тэрмін навучання. БДУ складаўся з 4 факультэтаў: фізіка-матэматычнага (з фізічным, матэматычным, механічным аддзяленнямі), біялагічнага (з батанічным, заалагічным, генетычным аддзяленнямі), хімічнага (з аддзяленнямі неарганічнай і арганічнай хіміі) і геалагічнага (з геалагічным і глебазнаўчым аддзяленнямі). Аднак геафак так і не змог распачаць сваю дзейнасць: замест яго на біяфаку адчынілася геалагічнае аддзяленне.

19 верасня 1932 года выйшла пастанова ЦВК СССР "Аб навучальных праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах". У пастанове асуджаліся пастаянныя рэарганізацыі, якія стваралі становішча няўстойлівасці і няўпэўненасці, асуджаўся як заганны брыгадна-лабараторны метад выкладання.

Згодна з планам, з 1932/1933 навучальнага года універсітэт пераходзіў на уніфікаваны навучальны год. З 1 кастрычніка 1932 года ўводзіўся шасцідзённы працоўны тыдзень, цвёрды расклад заняткаў, складзены на семестр, стыпендыі выдаваліся ў залежнасці ад паспяховасці. Адпаведна з гэтым, ва універсітэце пачалі ствараць новыя праграмы і навучальныя планы.

У 1932 годзе ўзрасла колькасць студэнтаў. Увосень было прынята 286 чалавек, з іх 133 — на вячэрнае аддзяленне. На 2 снежня на факультэтах і рабфаку было 816 студэнтаў. Пры гэтым ускладнялася пытанне з выкладчыцкімі кадрамі. Як ужо згадвалася, шмат выкладчыкаў працавала ў БДУ па сумяшчальніцтве. Не трэба забываць і пра палітычныя працэсы, што адбываліся ў СССР: у гэты час уводзілася пашпартная сістэма, і цэлыя катэгорыі насельніцтва пазбаўляліся грамадзянскіх правоў — станавіліся "лішэнцамі". Закранула гэта і БДУ. Так, адмовілі ў выдачы пашпарта прафесару БДУ А.У. Фядзюшыну. Тры месяцы І.Ф. Ермакоў і дэкан біяфака А. Дзярбенцаў дбалі пра пашпарт для А.У. Фядзюшына. Але той усё адно быў высланы ў Сібір.

Кадравая праблема ўскладнялася і тым, што ва універсітэце па прапанове І.Ф. Ермакова ў 1932/33 навучальным годзе актыўна ствараліся новыя кафедры: педагогікі і педалогіі, марксізму-ленінізму, механікі, ваенная. Планавалася ў 1933/34 навучальным годзе адкрыць кафедры фізічнай і калоіднай хіміі, палітэканоміі. Згодна з пастановай СНК БССР ад 2 чэрвеня 1933 года, пры БДУ стваралася аспірантура. Былі і скарачэнні: 30 чэрвеня 1933 года было зачынена геалагічнае аддзяленне ў сувязі са спыненнем дзейнасці Белгеаразведкі і перадачы геаработ па БССР Масгеаразведцы.

Улетку 1933 года пачаліся новыя складанасці з інтэрнатамі. Выдзеленыя Менгарсаветам будынкі (замест ранейшых, забраных ім жа) былі занятыя ўстановамі і сем'ямі. Гэта прывяло да скарачэння паступаючых на рабфак БДУ.

У канцы жніўня ці ў пачатку верасня 1933 года І.Ф. Ермакоў быў вызвалены ад абавязкаў рэктара БДУ. Што паслужыла прычынай? Можна толькі здагадвацца, бо загад наркамата асветы ў архівах яшчэ не знойдзены.

На пачатку верасня 1933 года І.Ф. Ермакоў быў прызначаны начальнікам палітаддзела Шклоўскай МТС. Праца ў МТС была пастаўлена кепска: частымі былі аварыі трактароў, прастоі, перарасход паліва і г.д. Жорсткімі захадамі І.Ф. Ермакоў здолеў узняць дысцыпліну, аднак не ў яго сілах было знайсці добрае насенне, спыніць блытаніну ў разліках з калгасамі — усё тое, што было ўвогуле характэрна для сельскай гаспадаркі таго часу.

15 лютага 1935 года пасля ліквідацыі палітаддзелаў МТС І.Ф. Ермакоў быў прызначаны сакратаром Шклоўскага райкама. Сакратар ЦК КП(б)Б Д.І. Валковіч (выпускнік рабфака БДУ) паведаміў яму, што будзе цэлы шэраг інструкцыяў і пастановаў цэнтральных органаў, якія трэба выконваць безумоўна і абавязкова. Ужо пазней, падчас допытаў у НКУС, І.Ф. Ермакоў казаў, што пасяўныя планы раёну даводзіліся завышанымі, бо ў раёне не было столькі зямлі. Што ў залік нядоімак адбіраліся каровы, коні, прылады, вопратка, часам — апошняе. Што ўжо адных толькі пастановаў цэнтральных органаў было дастаткова, каб дэзарганізаваць сельскую гаспадарку. Пасля вось такіх прызнанняў Іван Фядотавіч, нібы спахапіўшыся, дадаў, што ўсе гэтыя мерапрыемствы рабіліся па загадах "нацфашысцкай арганізацыі".

У чэрвені 1937 года І.Ф. Ермакова выклікалі ў Менск. 22 чэрвеня ён стаў намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. Літаральна праз 5 дзён старшыня Дзяржплана Любовіч і два яго намеснікі былі арыштаваныя. У той час большасць наркамаў была арыштаваная. У верасні 1937 года і сам Д.І. Валковіч быў арыштаваны і расстраляны 27 лістапада 1937 года.

Што зрабіў І.Ф. Ермакоў на сваёй пасадзе — невядома. Сам Іван Фядотавіч так характарызаваў той час: "Наступіла поўная хваля адліву. Усе пахаваліся па сваіх норах. Ніхто нічога не ведаў, дзе хто..."

Між тым і на І.Ф. Ермакова збіраўся "кампрамат". У партарганізацыю Дзяржплана ўжо 4 жніўня 1937 года быў пасланы данос аднаго з былых работнікаў БДУ, загадчыка Менскага гарана М.А. Правільшчыкава: нібыта І.Ф. Ермакоў падчас працы ў БДУ "зажимал самокритику, засорял университет классово-чуждыми элементами, врагами народа" і г.д.

У студзені 1938 года адбыўся пленум Шклоўскага райкама КП(б)Б, дзе І.Ф. Ермакова абвінавачвалі ў іншых "грахах": "перагібах", "скрыўленні падаткавай палітыкі", "парушэннях рэвалюцыйнай законнасці", "правядзенні класава варожай палітыкі" і г.д. Справа І.Ф. Ермакова была перададзена ў Менск.

11 жніўня 1938 года ён быў арыштаваны. Падчас вобыску ў яго быў канфіскаваны "браўнінг" з патронамі — сапраўдная знаходка для следства: раз ёсць пісталет — значыць, тэрарыст! І.Ф. Ермакова абвінавацілі ў актыўным удзеле ў "нацфашысцкай арганізацыі". Вельмі хутка Іван Фядотавіч "даў" патрэбныя паказанні — з прызнаннем у прыёме на працу варожых элементаў, шавіністычным выхаванні студэнтаў, шкодніцтве ў сельскай гаспадарцы і г.д. Але "следству" гэтага было недастаткова. І.Ф. Ермакоў вымушаны быў пачаць абвінавачваць сябе і іншых у планах звяржэння савецкай улады і ўсталявання на Беларусі буржуазнага ладу. Аднак тых людзей, пра якіх казаў І.Ф. Ермакоў, ужо не было ў жывых: А.Р. Чарвякоў, М.М.Галадзед, Я.Б. Гамарнік, Д.І. Валковіч, А.М. Платун... З іх ужо не спытаеш. Дый што гэта за "нацфашызм" — прызнанне ў незавершанасці будаўніцтва лазні, тэатра, гасцініцы?!

На допыце 4 лістапада 1938 года Іван Фядотавіч адмовіўся ад усіх ранейшых паказанняў, заявіўшы, што пад фізічным уздзеяннем ён абгаворваў і сябе, і іншых. Так, казаў ён, былі памылкі, перагібы і недахопы ў працы, але праца ішла паводле дырэктываў партыі. 29 красавіка 1939 года па сканчэнні следства І.Ф. Ермакоў, не прызнаючы сябе віноўным, піша заўвагі па матэрыялах следства (яшчэ раней ён напісаў скаргу на імя наркама ўнутраных справаў БССР пра збіццё яго падчас следства, пра абгавор сябе і іншых). Следства зацягвалася...

29 снежня 1939 года справа па абвінавачванні І.Ф. Ермакова ў антысавецкай і контррэвалюцыйнай дзейнасці была спынена, а 30 снежня Іван Фядотавіч быў вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. З турмы выйшаў чалавек са зламаным здароўем.

Чаму яго вызвалілі? Магчыма, больш пільны разгляд "справы Ермакова" і вызваленне звязаныя са зменамі ў апараце НКУС СССР і БССР. Менавіта тады, у 1938 годзе, былі арыштаваныя як ворагі народа наркам НКУС СССР Яжоў, наркамы НКУС БССР Берман, Наседкін. Можа, істотныя кадравыя змены ў НКУС і выратавалі Івана Фядотавіча? А можа, адыграла ролю тое, што 17 верасня 1939 года СССР уступіў у ІІ Сусветную вайну, і НКУС, рыхтуючыся да "ачысткі" занятых тэрыторыяў ад новых "ворагаў", не жадаў важдацца з не такой ужо істотнай справай І.Ф. Ермакова?..

Івану Фядотавічу прад'яўлялі абвінавачанні ў злоўжыванні службовым становішчам, канфіскацыі ў сялян маёмасці за нявыплату імі дзяржпаставак і плацяжоў і незаконнае захаванне пісталета "браўнінг". Хутка, аднак, высветлілася, што І.Ф. Ермакоў як сакратар райкама КП(б)Б меў права на нашэнне зброі, толькі своечасова не працягнуў тэрмін захоўвання. Па астатніх абвінавачаннях намеснік пракурора БССР па спецсправах вынес рашэнне, што парушэнні рэвалюцыйнай законнасці ў Шклоўскім раёне пасля адпаведных указанняў ЦК КП(б)Б і СНК БССР былі своечасова выпраўленыя. Сведкі ж па справе І.Ф. Ермакова з'яўляюцца неаб'ектыўнымі, бо ў той ці іншай меры самі вінаватыя за парушэнні законнасці ў раёне. Пракурор прызнаў, што хаця І.Ф. Ермакоў і не правяраў сістэматычна дзейнасць свайго апарата, але судзіць яго за гэта "немэтазгодна і палітычна няправільна".

11 студзеня 1940 года крымінальная справа па абвінавачванні І.Ф. Ермакова была спынена.

Далейшы лёс Івана Фядотавіча Ермакова нам пакуль невядомы...

*А.А. ЯНОЎСКІ,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*прарэктар БДУ*
*па вучэбнай рабоце,*
*А.Г. ЗЕЛЬСКІ,*
*загадчык Музея гісторыі БДУ*

# НЯМА ПРАРОКАЎ У СВАЁЙ АЙЧЫНЕ...

У свой час, а гэта было ўжо больш за дзесяць год таму, савецкая (пераважна цэнтральная маскоўская) прэса з захапленнем пісала пра маскоўскага школьніка Лёву Фядотава, называючы яго прарокам, бо ён у сваім дзённіку за 17 дзён да пачатку Вялікай Айчыннай вайны больш-менш дэталёва напісаў пра магчымую дату пачатку вайны, захоп немцамі заходняй часткі СССР, барацьбу за Кіеў, акружэнне Ленінграда, наступленне немцаў на Маскву. Тыя, хто чытаў вытрымкі з яго дзённіка, адзначаюць пэўную апантаную наіўнасць аўтара, што, аднак, цалкам даравальна тагачаснаму савецкаму юнаку. Што ж датычыцца запісаў у далейшай частцы дзённіка, то развагі пра рознагалоссе сярод фашыстаў, пра смерць Гебельса ў канцы вайны і штурм савецкімі войскамі Берліна мала чаго вартыя, бо ў той час пісалі і пра хуткую пралетарскую рэвалюцыю ў Германіі, і прадказвалі смерць усіх фашысцкіх верхаводаў і г. д.

Аднак першая частка застаецца фактам. 5 чэрвеня 1941 года школьнік апісаў даволі дакладнае развіццё падзеяў пасля 22 чэрвеня 1941 года. Праўда, усё ж звычайным школьнікам Л. Фядотаў не быў, бо жыў ён не на маскоўскай ускраіне, а ў так званым "Доме на набярэжнай", дзе жылі сем'і высокапастаўленых асобаў, сябраваў з іх дзецьмі, у прыватнасці з дачкой генерала Якава Смушкевіча, начальніка ВПС РСЧА, бываў у іх кватэры. Так што інфармаванасць у яго была большай за звычайную.

А што б вы, шаноўныя чытачы, сказалі на тое, што не за некалькі дзён, а ў кастрычніку 1940 года студэнт нашага універсітэта прадказаў вайну СССР з Германіяй і Японіяй — вайну, якая пачнецца не пазней лета 1941 года?

Аднак — усё па парадку. У пачатку кастрычніка 1940 года ў сувязі з пастановай СНК СССР пра ўстанаўленне платнага навучання ў старэйшых класах сярэдніх школ і ВНУ СССР і пра змену парадку ў вызначэнні стыпендыяў у ВНУ ў Мінску і іншых гарадах Беларусі, дзе знаходзіліся навучальныя ўстановы, адбываліся стыхійныя студэнцкія хваляванні, у якіх бралі ўдзел і студэнты БДУ. У тыя дні мінскі пункт паштовай карэспандэнцыі НКУС БССР праглядаў 100 % гарадской зыходнай карэспандэнцыі дзеля высвятлення палітычных настрояў насельніцтва. Спецыяльная сакрэтная зводка з вытрымкамі з лістоў клалася на стол камісара дзяржбяспекі Л. Цанавы і сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі.

І сярод дзесяткаў вытрымак з лістоў студэнтаў сваім бацькам, родным і знаёмым уражвае адна, дзе сярод звычайнай інфармацыі ёсць вельмі цікавыя радкі. Вось вытрымкі з таго ліста (падаюцца ў перакладзе з захаваннем стылю аўтара):

"...Вы не можаце сабе ўявіць і адчуць, як цяжка пакідаць Універсітэт, не скончыўшы яго, пасля таго, калі прыйшлося столькі шмат цяжкага і зневажальнага перанесці, столькі шмат выпакутаваць... Магчыма, у хуткім будучым давядзецца апрануць на сябе лямку салдата... Зусім недалёкая тая злавесная гадзіна, калі нам прыйдзецца ваяваць амаль з усімі краінамі свету, дакладней, увесь свет будзе ваяваць супраць нас. Перш за ўсё, нам прыйдзецца сутыкнуцца з Германіяй і Японіяй, якія падрыхтаваны да вайны надзвычай моцна. У гэтай сусветнай вайне народаў людзі будуць гінуць у значна большай колькасці, чым у першай імперыялістычнай вайне 1914—18 гадоў. Добра, калі ў нас працягнецца мірнае становішча да лета наступнага года..."

Што гэта? Спантаннае прароцтва, простае супадзенне ці натхнёны аналіз? Пытанні, пытанні... Сярод гэтых пытанняў, дарэчы, і праблема аўтара гэтых радкоў. Вядома толькі, што пісаў ён у Магілёўскую вобласць, Бялыніцкі раён, Вішаўскі сельскі савет, п/а Нежкава, калгас імя Будзёнага свайму сваяку (магчыма, бацьку) Сіняўскаму Ягору Арцем'евічу. Калі гэтае дапушчэнне праўдзівае, то і прозвішча студэнта БДУ — Сіняўскі. Але на якім факультэце і курсе вучыўся ён, калі нарадзіўся і які быў яго далейшы лёс — невядома.

Наш студэнт "убачыў" і глабальныя планы таварыша Сталіна наконт захопу свету ("увесь свет будзе ваяваць супраць нас"), і вайну з Германіяй і Японіяй, і нават (прыблізна) дату вайны — лета 1941 года. Гэтага на той момант не ведалі ні Сталін, ні Гітлер, бо апошні планаваў, як вядома, пачатак вайны з СССР на май 1941 года.

*А.Г. ЗЕЛЬСКІ,*
*загадчык Музея гісторыі БДУ*

**ВЫСТАВЫ**

# *Далёкія і блізкія японцы*

У Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь 4 чэрвеня адкрылася цудоўная выстава японскай керамікі. Арганізавалі яе Японскі фонд, міністэрства замежных спраў Японіі, пасольства Японіі ў нашай краіне, а таксама міністэрства культуры Беларусі.

Японскі фонд, заснаваны ў 1972 годзе дзеля папулярызацыі японскай культуры ў свеце, падрыхтаваў для беларускіх аматараў мастацтва сустрэчу з творчасцю сучасных майстроў-керамістаў. Увогуле ж, ганчарнае мастацтва ў Японіі налічвае за сваёй спінай ужо амаль сем тысячаў гадоў. Вядома, за такі працяглы час склаліся глыбокія традыцыі (усе мы чулі пра кансерватызм і традыцыяналізм японцаў!), многія з якіх дажылі да нашых дзён. Некаторыя ганчарныя цэнтры (майстэрні Арыта, Хагі, Бідзэн і г.д.) захоўваюць нязменную папулярнасць на працягу некалькіх стагоддзяў.



Тыя, хто ўжо наведаў выставу, мог належным чынам ацаніць керамічныя вырабы (пераважна посуд) японскіх майстроў: сціплыя талеркі, збаны, чашы класічных формаў з някідкімі, сціплымі фарбамі суседнічалі з посудам самых мадэрнісцкіх канструкцыяў, расфарбаваным у маляўнічыя, вясёлыя колеры. Асабіста мне найбольш паглянулася талерка, знарок зробленая з расколінай: галубы, якія ўпрыгожвалі посуд, нібыта імкнуліся зляцець з малюнка і менавіта сваім памкненнем разбівалі талерку...

Кераміка — гэта той від мастацтва, які здаўна вядомы ў Беларусі. Мажліва, таму выстава японскіх майстроў здаецца такой блізкай і зразумелай. І разам з тым — дае магчымасць паглядзець па-іншаму на свет, на мастацтва, на чалавека. На гэтай выставе вы зможаце адчуць, якія яны далёкія ад нас і якія разам з тым блізкія, японцы. Наведайце: выстава будзе працаваць у музеі да 24 чэрвеня.

*Зьміцер ДЗЯДЗЕНКА*

# МЫ І СУСВЕТ

## 5 ЧЭРВЕНЯ – ДЗЕНЬ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ

З самага свайго з'яўлення на зямлі чалавек імкнуўся падпарадкаваць навакольнае асяроддзе сваім мэтам. Надзвычайныя поспехі ў гэтай галіне былі дасягнуты ў XX стагоддзі, калі развіццё навукі і тэхнікі дасягнула свайго апагею, а ў зону эканамічных інтарэсаў былі ўцягнуты Сусветны акіян з бліжэйшым космасам. Зразумела, што такое развіццё падзей прывяло да рэзкага росту спажывання ўсіх відаў рэсурсаў і сыравіны. У выніку навукоўцы пачалі весці размову пра так званую тэхнасферу – частку біясферы,ператвораную людзьмі з дапамогай прамога ці ўскоснага ўздзеяння тэхнічных сродкаў для найлепшай адпаведнасці сацыяльна-эканамічным патрэбам чалавецтва.

Фарміраванне тэхнасферы суправаджаецца інфармацыйным выбухам, які падсілкоўваецца за кошт найноўшых сістэм спадарожнікавай сувязі, оптыка-валаконных сетак, суперкамп'ютэраў і іншых тэхналагічных дасягненняў. З аднаго боку, гэта спрыяе аздараўленню насельніцтва, паляпшэнню медабслугоўвання і ўзроўню адукацыі на ўсёй планеце. Але аўтаматызацыя выклікае рост вытворчасці працы з адначасовым ростам беспрацоўя і спажывання сыравіны, што вядзе да паглыблення экалагічных праблем. Статыстыка сведчыць, што ў сярэднім штодзённа ў акіян трапляе 12 тысяч барэляў сырой нафты, 140 відаў жывых арганізмаў аказваецца пад пагрозай знішчэння, а "аўтанасельніцтва" Зямлі павышаецца на 140 тысяч аўтамабіляў усіх тыпаў. Спіс можна працягнуць, але зразумела, што і ўсё вышэйпералічанае дае дадатковы ўціск на навакольнае асяроддзе. У выніку ў XXI стагоддзі чалавецтва можа апынуцца на мяжы глабальнага экалагічнага крызісу, калі само існаванне жыцця будзе пастаўлена пад пагрозу. Такая магчымасць не можа не выклікаць трывогі як за прыроду ў цэлым, так і за асобныя экасістэмы, віды жывёлаў і раслінаў.

Яшчэ ў 60-я гады XX стагоддзя знакаміты англійскі звералоў, даследчык, навуковец і пісьменнік Джэральд Дарэл пісаў: "Мяне, як і многіх людзей, вельмі непакояць тыя абставіны, што паўсюдна з году ў год чалавек павольна, але верна, прама ці ўскосна знішчае розныя віды дзікіх жывёл... Я ведаю масу відаў, якія не могуць разлічваць на патрэбную абарону, бо яны залішне дробныя, і не ўяўляюць каштоўнасці ні для камерцыі, ні для турызму. У маіх вачах знішчэнне любога віду – крымінальны акт, роўны знішчэнню непаўторных помнікаў культуры – такіх, як карціны Рэмбранта ці Акрополь". Прайшлі гады, і ў 1992 годзе ў Рыа-дэ-Жанейра на 2-й канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіцці былі прыняты дзве канвенцыі, якія акрэслілі экалагічную палітыку сусветнай супольнасці на XXI стагоддзе – Канвенцыя аб устойлівым развіцці і Канвенцыя аб біялагічнай разнастайнасці. Згодна з гэтымі кіраўнічымі дакументамі праводзіць экалагічную палітыку кожная дзяржава свету, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь.

Зразумела, што без міжнароднага супрацоўніцтва нельга вырашыць глабальныя праблемы. Але іх вырашэнне немагчыма без асэнсавання кожным з нас сябе як часткі навакольнай прыроды. А зрабіўшы гэта, патрэбна імкнуцца дапамагчы прыродзе захаваць сябе: што можа быць прасцей, чым прыбраць за сабою смецце на месцы пікніка, палюбавацца прыгожай кветкай, не зрываючы яе, ці, зрабіўшы шпакоўню, зафіксаваць яе на дрэве не цвікамі, а шпагатам ці дротам? Простыя, нават банальныя ісціны, але колькі дробных, непрыкметных для вока экалагічных крызісаў можна пазбегнуць дзякуючы такім ці прыблізна такім простым дзеянням! Сваімі паважнымі да прыроды паводзінамі мы дапамагаем захаваць мілыя нашаму воку краявіды для сваіх нашчадкаў, якім наўрад ці спадабаецца атрымаць у спадчыну тэхнагенную пустыню.

Французскі астраном, які адкрыў Нептун, Урбан Ляўе аднойчы сказаў: "Калі немаўля выкідвае з калыскі цацку, яно гэтым выклікае абурэнне зорак у сусвеце". Толькі памятаючы, што любое нашае дзеянне рэхам адгукаецца ў навакольным асяроддзі, мы зможам захаваць прыроду і сябе. Доўгі час з жорсткасцю дзіцяці чалавек імкнуўся падпарадкаваць сабе прыроду і тым самым паставіў пад пагрозу сваё ўласнае існаванне. Зямля ў нас адна, і толькі клапоцячыся пра яе, як пра сваю маці, мы зможам пакінуць сваім нашчадкам такі сусвет, дзе хопіць месца і чалавеку з яго гаспадаркай, і прыродзе з усімі яе краявідамі, жывёламі і птушкамі.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт IV курса*
*геаграфічнага факультэта*

**НАВІНЫ СТУДГАРАДКА**

# ПАРУШАЛЬНІКІ ЗАСЕЛЯЦЦА АПОШНІМІ

У студэнцкім гарадку прайшло заключнае пасяджэнне Савета па прафілактыцы парушэнняў правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ.

На пасяджэнні разглядаліся хадайніцтвы парушальнікаў. З 17 пададзеных хадайніцтваў 10 былі задаволеныя: гэтыя студэнты будуць засяляцца ў інтэрнаты пасля 15 верасня пры наяўнасці вольных месцаў. Разгляд астатніх 7 хадайніцтваў і канчатковае рашэнне па іх перанесены на восень.

На пасяджэнні быў зацверджаны праект загаду пра пазбаўленне права пражывання на будучы навучальны год. У прыкладным спісе кандыдатаў пакуль 103 чалавекі. Чакаецца, што гэтая лічба стане большай пасля таго, як усіх, хто запазычыўся па аплаце за пражыванне, і штрафнікоў па адпрацоўках уключаць у гэты "чорны спіс".

Вынікі працы Савета па прафілактыцы ў 2000/2001 навучальным годзе былі падведзеныя на пасяджэнні, а таксама быў складзены план працы на наступны год.

Новым старшынёй Савета па прафілактыцы быў абраны Дзмітрый Зімніцкі (IV курс хімічнага факультэта).

*Інфармацыйная служба*
*студэнцкага гарадка БДУ*

**ПОСТФАКТУМ**

# *Семінар па дэкаланізацыі*

Мэтай семінару па дэкаланізацыі, які адбыўся ў Гаване, стаў агляд становішча малых астраўных дзяржаваў, якія кіруюцца іншымі дзяржавамі.

"Дэкаланізацыя насамрэч з'яўляецца адной з паспяховых старонак паўвекавой гісторыі, і мы павінны прыкласці намаганні, каб давесці пачатую справу да канца", – гаворыцца ў пасланні Генеральнага сакратара ААН Кофі Анана ўдзельнікам Карыбскага рэгіянальнага семінару.

Сп. Анан адзначыў, што сустрэча, арганізаваная Спецыяльным камітэтам ААН па пытаннях дэкаланізацыі, "дае нам унікальную магчымасць зноў пацвердзіць сваю прыхільнасць дасягненню мэты, калі ўсе народы змогуць ажыццяўляць свае права на самавызначэнне ў адпаведнасці з адпаведнымі рэзалюцыямі Генеральнай Асамблеі".

Генеральная Асамблея ААН устанавіла спецыяльны камітэт па ажыццяўленні кантролю за выкананнем палажэнняў Дэкларацыі па прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам ад 1960 года. Генеральны сакратар ААН нагадаў, што з часу прыняцця гэтага важнейшага дакумента "больш за 80 мільёнаў чалавек набылі незалежнасць", аднак ён дадаў, што "ў свеце ўсё яшчэ налічваецца 17 несамакіруемых тэрыторыяў".

Удзельнікі семінару далі ацэнку становішчу на гэтых тэрыторыях, надаўшы асаблівую ўвагу іх канстытуцыйнаму імкненню да самакіравання. Мэтай семінару было таксама вызначыць сферы, дзе міжнародная супольнасць можа пашырыць свой удзел у справе ажыццяўлення праграмаў дапамогі, а таксама вызначыць усебаковы падыход да забеспячэння ўстойлівага палітычнага развіцця на гэтых тэрыторыях.

Семінар праводзіўся ў рамках Другога міжнароднага дзесяцігоддзя па выкараненні каланіялізму (2001–2010 гг.), і яго правядзенне супала з Тыднем салідарнасці з народамі несамакіруемых тэрыторыяў, якая пачалася з 25 мая.

У лік 17 несамакіруемых тэрыторыяў уваходзяць Заходняе Самоа, Усходні Тымор, Гуам, Новая Каледонія, Піткерн, Такелаў, Ангіла, Бермуда, Брытанскія Віргінскія астравы, Кайманавы астравы, Фалклендскія/Мальвінскія астравы, Гібралтар, Масэрат, востраў Святой Алены, астравы Тэркс і Кайкас і Віргінскія астравы ЗША.

*Па паведамленні Прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

**ФОТАПОЗІРК**



*Фота IREX/PROMEDIA*

*Добры настрой у Алены Целеш, студэнткі 5-га курса хімічнага факультэта БДУ, пасля паспяховага заканчэння серыі вопытаў*

**ЗНАЁМЦЕСЯ**

# ВЫДАННЕ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЎМЕЕ ДУМАЦЬ

Менавіта гэты лозунг вынесены на вокладку штомесячнага навукова-практычнага часопіса "Изобретатель", які распаўсюджваецца па Беларусі і краінах СНД тыражом у 1500 экземпляраў. Яго заснавальнікамі сталі грамадскае аб'яднанне "Беларускае аб'яднанне вынаходнікаў і рацыяналізатараў" і часопіс "Народная кніга". Павел Стасевіч, аўтар ідэі і яе канцэптуальнай распрацоўкі, стаў галоўным рэдактарам, а ў склад рэдкалегіі ўвайшлі людзі, якія прафесійна працуюць у галіне вынаходніцтва і рацыяналізацыі. Гэта дазволіла стварыць даволі змястоўны і разнастайны часопіс, цікавы не толькі для прафесіяналаў, але і для ўсіх, хто цікавіцца апошнімі дасягненнямі ў галіне навукі і тэхнікі.

Часопіс вылучаецца простай для ўспрыняцця мовай папулярных артыкулаў, але адначасова дае вычарпальныя звесткі і тэхнічную дакументацыю ў матэрыялах прыкладнога характару. Тэмы матэрыялаў таксама разнапланавыя: гісторыя паходжання звыклых сёння тэхнічных сродкаў (напрыклад, кола і веласіпеда), прагнозы на будучыню для распрацовак, якія сёння пакуль што з'яўляюцца для нас "ноў-хаў" (інфармацыйныя тэхналогіі). Ёсць у часопісе і ўрыўкі з дакументальных аповесцяў, прысвечаных аналізу той ці іншай праблемы сучаснасці (атамная энергія), і праекты, якія могуць ажыццявіцца ў "хатніх умовах" (парады хатняму майстру і завочная школа працы з персанальным камп'ютэрам). А напрыканцы часопіса ёсць красворд, што дазваляе чытачу і адпачыць, і ўзняць свой асабісты адукацыйны ўзровень (адказы дадаюцца).

Акрамя "традыцыйнага" выканання часопіс "Изобретатель" мае інтэрнэт-версію, што знаходзіцца па адрасе: www.izobretatel1.narod.ru. Знаходзьце і чытайце.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геаграфічнага факультэта*

**ДЛЯ ЦЯБЕ**

# Адукацыя за мяжой

Міжнародная грамадская арганізацыя "Міжнароднае аб'яднанне сяброў Беларускага дзяржаўнага універсітэта" (МАС БДУ), Міжнародны вузаўскі цэнтр "Знание" прадастаўляюць жадаючым магчымасць атрымаць адукацыю за мяжой: у Аўстраліі, Канадзе, Вялікабрытаніі, Германіі, Ірландыі, Новай Зеландыі, Францыі, ЗША, ПАР і іншых краінах.

Прапануюцца:

— канікулярныя праграмы;

— агульныя і спецыялізаваныя курсы замежных моў на працягу ўсяго года;

— дзяржаўныя і прыватныя школы і каледжы;

— дауніверсітэцкія праграмы, вышэйшая адукацыя.

Тэл. у Мінску 264-07-84, 209-53-12, 209-53-50, 209-54-34, 209-53-51, e-mail: mod@org.bsu.unibel.by.

Тэл. у Маскве (095) 238-08-61, 238-11-45; fax. (095) 236-97-26, 148-99-64; e-mail: iuc@tmiu.ru; znaniye@postman.ru.

**САКРЭТ ФІРМЫ**

# РЭСПУБЛІКАНСКІ ЦЭНТР ІНТЭРНЭТ-АДУКАЦЫІ

Рэспубліканскі цэнтр інтэрнэт-адукацыі з'явіцца ў Мінску. У яго арганізацыі прымае актыўны ўдзел Федэрацыя інтэрнэт-адукацыі, створаная пад патранажам расійскага ўрада. Мяркуецца, што цэнтр адкрыецца сёлета на пачатку кастрычніка на базе Белдзяржуніверсітэта. Такое рашэнне было прынятае ў выніку шэрага рабочых сустрэчаў, праведзеных у канцы мая ў Мінску кіраўніцтвам Федэрацыі. З беларускага боку ў іх прымалі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра нашай краіны Міхаіл Дзямчук, міністр адукацыі Беларусі Васіль Стражаў, рэктары мінскіх ВНУ і прадстаўнікі прадпрыемстваў. Галоўная мэта гэтага сумеснага праекта — падрыхтоўка новага пакалення выкладчыкаў. Ужо ў бліжэйшы час 100 чалавек з Беларусі пройдуць курс навучання інтэрнэт-тэхналогіям на базе Маскоўскага цэнтра інтэрнэт-адукацыі.

*Вольга СКАРБІШ*

# НАВУЧАЦЦА – ВЫГОДНА

Як паведаміла радыёстанцыя "Нямецкая хваля", выпускнікі ВНУ карыстаюцца попытам на рынку працы ў Германіі. Да такой высновы прыйшлі прафесары Ульрых Тайхлер і Гаральд Шомбург (універсітэт Каселя). Навукоўцы правялі сацыялагічнае даследаванне, у якім удзельнічалі 6000 выпускнікоў нямецкіх ВНУ. Ім прапанавалі адказаць на пытанне: "Ці выгодна навучацца ў ВНУ ва ўмовах зніжэння кан'юнктуры?"

Высветлілася, што з фінансавага пункту гледжання навучацца выгодна. Ужо праз чатыры гады пасля заканчэння навучання заробак выпускнікоў складае (у залежнасці ад набытай спецыяльнасці) ад 56 000 да 91 000 марак у год. І нават студэнты, якія навучаюцца на спецыяльнасцях, ад якіх не варта чакаць хуткага працаўладкавання і кар'еры, з аптымізмам глядзяць у будучыню. Яны лічаць сваю будучую прафесію патрэбнай і карыснай.

Зрэшты, не абышлося без крытычных заўваг. Перадусім, апытаныя пагаджаюцца на думцы, што вышэйшыя школы Германіі выказваюць мала клопату пра будучыню сваіх студэнтаў.

Прафесары Тайхлер і Шомбург працуюць у цэнтры па даследаванні працы прафесійна-тэхнічных і вышэйшых навучальных установаў. Больш за 700 падрыхтаваных імі публікацыяў прысвячаюцца найперш праблемам узаемасувязяў навучальна-адукацыйнага і вытворчага працэсу, параўнаўчага аналізу міжнароднай сістэмы вышэйшай адукацыі, супрацоўніцтва паміж ВНУ розных краінаў.

*Вольга СКАРБІШ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Ум. друк. арк. 1

Падпісана да друку ў 12.00

14 чэрвеня

Зак. 366у

Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Юрыя Жукава